# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта, 23 сакавіка 2000 года, чацвер, № 4 (1816)


ГОСЦІ Ў ХАТУ

## НА ВУЧОБУ Ў МАСКВУ?

24 лютага гэтага года рэктар Маскоўскага дзяржаўнага інстытута міжнародных адносін, член калегіі МЗС Расійскай Федэрацыі Анатоль Васільевіч Таркуноў сустрэўся са студэнтамі і выкладчыкамі БДУ у будынку рэктарата.

Па словах Анатоля Таркунова, ён ужо даўно марыў наведаць наш універсітэт, які яму вельмі спадабаўся.

Рэктар МДІМА адказаў на пытанні студэнтаў і выкладчыкаў, расказаў пра працэс падрыхтоўкі спецыялістаў у сферы міжнародных адносін, палітыкі, журналістыкі, турызму, бізнесу, гандлю.

Асноўнай мэтай у гэтым працэсе з'яўляецца якасць адукацыі і адпаведнасць яе міжнародным стандартам. А гэта, у сваю чаргу, дапамагае ажыццяўляць працаўладкаванне выпускнікоў не толькі ў Расіі, але і за мяжой. Універсітэт зараз уваходзіць у Асацыяцыю прафесійных школ міжнародных адносін.

Асаблівасцю МДІМА з'яўляецца тое, што школьнікі перад паступленнем маюць магчымасць прайсці двухгадовыя курсы, дзе акрамя іншых прадметаў ёсць магчымасць вывучаць усходнія мовы. Такія абітурыенты хутчэй і лепш здаюць уступныя экзамены.

Адзін з важнейшых кірункаў — гэта забеспячэнне студэнтаў новымі сучаснымі падручнікамі. Абавязковым з'яўляецца вывучэнне дзвюх моў. Першая, англійская, выкладаецца 10 гадзін на тыдзень, а другая, па выбары — 6 гадзін. Таксама можна вывучаць і трэцюю мову, але ўжо за дадатковую плату. У інстытуце навучаецца 4 тысячы студэнтаў, 40% атрымлівае адукацыю на платнай аснове. Сярод іх студэнты з 55 краін, у тым ліку і з Беларусі. Кожны год бясплатна 5 чалавек з нашай краіны едзе вучыцца ў Маскву. Зараз у МДІМА навучаецца 20 чалавек з Беларусі, астатнія ж маюць магчымасць паступаць у інстытут па агульным конкурсе, які складае прыкладна 5—7 чалавек на месца. Першыя пяць студэнтаў з Беларусі ўжо амаль атрымалі ступень бакалаўра. Не забыліся і на выкладчыкаў. У іх ёсць магчымасць стажыравацца.

Анатоль Таркуноў выказаў спадзяванні, што Беларусь і Расія будуць разам вырашаць усе свае праблемы, не толькі ў сферы адукацыі, але і ў палітыцы і эканоміцы. Пэўныя крокі ўжо зроблены, хаця галоўнае — наперадзе.

*Таццяна ЯКУБЯНЕЦ,*
*Ксенія МАСАЛЁВА*

ФЕСТЫВАЛІ

## *Сярэбраныя струны – 2000*

У гэтым годзе фестываль аўтарскай песні "Сярэбраныя струны" быў прысвечаны Дню абаронцы Айчыны. Таму ў праграме гучалі ў асноўным песні патрыятычнай тэматыкі.

У гала-канцэрце, што адбыўся 18 лютага ў актавай зале філалагічнага факультэта БДУ, узялі ўдзел не толькі лаўрэаты фестывалю, але і госці — пераможца фестывалю "Сярэбраныя струны" 1999 года Аліна Осіпава і прэзідэнт клуба аўтарскай песні БДУ Аляксей Нежавец, які і ўручыў узнагароды лаўрэатам.

Дыпломамі III ступені былі ўзнагароджаны студэнты 2-га курса фізічнага факультэта Сяргей Драмук і Уладзімір Малышка (інтэрнат №2), а таксама студэнтка 1-га курса факультэта журналістыкі Руслана Гасанава (інтэрнат №10).

Дыпломы II ступені атрымалі студэнтка 2-га курса факультэта журналістыкі Марыя Садоўская (інтэрнат №10) і студэнт 3-га курса ФПМіІ Павел Куцік (інтэрнат №3).

Зразумела, I прэмію атрымалі найлепшыя. Віншуем з перамогай Уладзіміра Ермака — студэнта 5-га курса філалагічнага факультэта з інтэрната №7 і Максіма Шуміліна — студэнта 2-га курса факультэта журналістыкі з інтэрната №10.

Асобна можна вылучыць выступленне студэнтаў 1-га курса геаграфічнага факультэта (інтэрнат №2). Аляксандр Куклік, Сяргей Куклаў і Аляксей Трафімаў, выступаючы тут упершыню, атрымалі высокія ацэнкі журы і гран-пры фестывалю. Мы вельмі ўдзячныя ўсім удзельнікам і жадаем ім творчых поспехаў.

*Святлана ДАЛГАНЮК,*
*педагог-арганізатар*
*Фотаздымак*
*Аляксандра ЗАПОЛЬСКАГА*



*Уладальнікі гран-пры фестывалю "Сярэбраныя струны – 2000"*

СУСТРЭЧЫ

## ДЗЕСЯЦЬ ВЯКОЎ БЕЛАРУСКАЙ ГІСТОРЫІ

У суботу 26 лютага адбылася сустрэча студэнтаў геаграфічнага факультэта з вядомым беларускім пісьменнікам Уладзімірам Арловым, аўтарам многіх гістарычных твораў. На сустрэчы ім была прадстаўлена кніга "Дзесяць вякоў беларускай гісторыі (862—1918)", напісаная ў сааўтарстве з Генадзем Сагановічам. Кніга ўяўляе сабой альбом вялікага фармату, багата ілюстраваны, які ў асобных нарысах распавядае пра многія цікавыя факты нашай гісторыі. Гэтае выданне ўбачыла свет напрыканцы 1999 года і яго можна яшчэ знайсці на паліцах кніжных магазінаў. Уладзімір Арлоў таксама прачытаў прысутным лекцыю па гісторыі Беларусі, расказаў пра сваю творчасць, адказаў на пытанні. Падчас сустрэчы працаваў кніжны кіёск, дзе кожны жадаючы мог набыць новую кнігу пісьменніка. Вечарына атрымалася вельмі цікавай.

*Вадзім ЗУБРЫЦКІ*

# СУЧАСНЫ ФАКУЛЬТЭТ У КЛАСІЧНЫМ УНІВЕРСІТЭЦЕ

*У першы дзень вясны, 1 сакавіка, эканамічны факультэт БДУ адсвяткаваў свой дзень нараджэння. З гэтай нагоды карэспандэнт "Беларускага універсітэта" сустрэўся з дэканам эканамічнага факультэта, прафесарам Міхаілам Міхайлавічам Кавалёвым, які расказаў, што зроблена за гэты час і чым жыве факультэт сёння:*

— У БДУ, як у кожным класічным універсітэце Еўропы альбо Амерыкі, ёсць усе напрамкі. І, вядома ж, у любым, ці то еўрапейскім, амерыканскім альбо японскім універсітэце, адным з найбольш прэстыжных факультэтаў заўсёды з'яўляецца эканамічны.

На жаль, мы пакуль што невялікі факультэт. Але ж тым не менш ужо год, як мы існуем, на факультэце навучаецца каля 600 студэнтаў, ёсць ужо пяць кафедраў. Больш таго, тры з іх вельмі сучасныя, створаны за гэты год. Гэта кафедры менеджменту, банкаўскай эканомікі, эканамічнай інфарматыкі. І ўзначальваюць іх вельмі добрыя спецыялісты. Я думаю, што гэта нават лепшыя спецыялісты ў рэспубліцы па сваіх кірунках. І, як вы разумееце, ад таго, якія ў нас будуць выкладчыкі, залежыць якасць нашай працы.

Мы марым, каб наш факультэт быў сучасным, элітным і цесна звязаным з жыццём нашай дзяржавы. Наш першы дэвіз — вучоныя і студэнты факультэта павінны ўплываць на тое, што робіцца ў эканоміцы краіны. Сапраўды, ад таго, які прафесійны ўзровень будуць мець эканамісты ў краіне, будзе залежыць наша жыццё, такім будзе дабрабыт дзяржавы і кожнай сям'і. Трэба заўсёды памятаць, што ад эканамістаў залежыць у цэлым якасць эканамічнай палітыкі дзяржавы, фірмы, і нават, як кажуць эканамісты, хатняй гаспадаркі. За год надрукавана сотні навукова-папулярных артыкулаў, інтэрв'ю ў самых розных беларускіх выданнях і на самыя розныя тэмы. Таму што адна з місій факультэта — гэта несці эканамічную культуру, эканамічныя веды ў самыя шырокія масы. Гэта вельмі патрэбна ў рыначнай эканоміцы, калі кожны чалавек павінен сам думаць за сябе і за сваю сям'ю. І кожнаму трэба навучыцца найлепш выкарыстоўваць тыя рэсурсы, якія ён мае. А гэта і ёсць галоўная задача, рашаць якую мы вучым нашых студэнтаў. Таму амаль усе студэнты, пачынаючы нават з першага курса, ужо прымаюць удзел у нашых канкрэтных праектах з банкамі, дзяржаўнымі ўстановамі, прадпрыемствамі, фірмамі. З аднаго боку, у нашым Цэнтры маркетынгавых даследаванняў пры факультэце выконваюцца канкрэтныя працы, з другога боку, нашы студэнты, аспіранты, выкладчыкі працуюць кансультантамі, экспертамі, практыкантамі ў самых розных установах, пачынаючы з Адміністрацыі Прэзідэнта, Нацыянальнага банка, Савета Міністраў і заканчваючы невялікімі фірмамі. Я спадзяюся, што гэты ўплыў з цягам часу будзе ўсё больш абгрунтаваным і да нашай думкі будуць усё больш прыслухоўвацца. З гэтай мэтай запланаваны шэраг канферэнцый, семінараў. Напрыклад, 22 сакавіка пройдзе сумесная з Нацыянальным банкам навукова-практычная канферэнцыя "Уздзеянне крэдытна-грашовай палітыкі на стан транзітыўнай эканомікі".

Наш другі дэвіз — эканаміст павінен ведаць жыццё, і ў першую чаргу тых краін, дзе рыначная эканоміка эфектыўна працуе. Яшчэ ў студэнцкія гады ён павінен знайсці сабе за мяжой калег для будучага бізнесу. Таму ўсталяваны кантакты з шэрагам замежных універсітэтаў, асабліва па такой новай тэматыцы, як сучасныя тэхналогіі маркетынгу і бізнесу. Мы за гэты год сталі галаўной арганізацыяй сярод краін СНД па стварэнні міждзяржаўнага цэнтра электроннага бізнесу. Усталяваны кантакты і з далёкім замежжам — Грэцыяй, Іспаніяй, Францыяй, ЗША па гэтай тэматыцы. Спадзяюся, што з дапамогай сучасных тэхналогій, тэхналогіі Інтэрнэта нашы тавары знойдуць новыя замежныя рынкі.

У бліжэйшых планах факультэта — арганізацыя павышэння кваліфікацыі па сучасных тэхналогіях міжнароднага бізнесу для ўсіх тых, хто адказвае на прадпрыемствах за экспарт прадукцыі.

Трэці дэвіз нашага факультэта — гэта сучаснасць. Сучаснасць ва ўсім. Напрыклад, сучасныя падручнікі. Існуе вялікая праблема: старыя прадручнікі — гэта толькі палітэканомія Маркса, новыя — толькі эканомікс ЗША. Эканоміка ж намнога больш шырэйшая і глыбейшая, чым проста марксізм ці эканомікс. А ўсе кнігі па эканоміцы, якія перакладзены на сённяшні час, грунтуюцца на амерыканскіх прыкладах. Нам жа патрэбны падручнікі, якія пабудаваны на нашым жыцці, на жыцці іншых дзяржаў з пераходнай эканомікай. Таму мы выступілі з ініцыятывай сумесна з іншымі эканамічнымі факультэтамі шматпрофільных універсітэтаў Беларусі падрыхтаваць серыю падручнікаў "Фундаментальная эканоміка".

Сучаснасць не толькі ў падручніках, але і ў тэхналогіях выкладання. Таму чацвёрты дэвіз — эканаміст павінен валодаць аналітыкай (статыстыка, камп'ютэры, мадэлі). Мы ствараем базы статыстычных даных, базы даных дзяржаўных праграм нашай рэспублікі, Расіі, іншых краін — студэнт-эканаміст без статыстыкі не можа працаваць. Пры факультэцкай бібліятэцы будзем ствараць камп'ютэрны цэнтр эканамічнай інфармацыі і дакументаў. Сучаснасць і ў стылі выкладання прадметаў. Мы імкнемся да таго, каб ужо на лекцыях выкарыстоўваць сучасныя камп'ютэрныя тэхналогіі Інтэрнэта, праекцыйную тэхніку. Частка заняткаў вядзецца на замежных мовах. Практыкуюцца новыя метады палітыка-эканамічных дыскусій, аналітычных запісак накшталт "Калі б міністрам эканомікі (фінансаў) быў я" і г.д.

Дарэчы, неабходна зазначыць, што ў рэспубліцы вельмі не хапае таленавітых выкладчыкаў-эканамістаў. Каб вырашыць гэтую праблему, мы пашырылі амаль у два разы аспірантуру і магістратуру. Стаўка робіцца на маладых людзей, якія ўжо праз год-другі могуць стаць выкладчыкамі, не зашоранымі догмамі "Капітала" Маркса, які, дарэчы, мы таксама вывучаем. Большасць з іх праходзіць практыку або стажыроўку ў Германіі, ЗША, Францыі. Нават у дзень нараджэння факультэта, я думаю, кожны пяты з нашых выкладчыкаў знаходзіцца ў замежнай камандзіроўцы.

І наступны дэвіз факультэта — гэта элітнасць. Паколькі наш факультэт яшчэ невялікі, нам вельмі важна, каб на ім вучыліся самыя разумныя і энергічныя. З гэтай мэтай абвешчана алімпіяда па эканоміцы і матэматыцы. Мы зараз працуем з шэрагам эканамічных ліцэяў, каледжаў рэспублікі, каб сумесна напрыканцы красавіка правесці канферэнцыю па эканоміцы для таленавітых школьнікаў. Пры падтрымцы Сусветнага банка вучоныя факультэта рэалізуюць праект па павышэнні кваліфікацыі настаўнікаў эканомікі ў школах.

Мы спадзяемся, што вынікам гэтага будзе тое, што на факультэт прыйдуць вучыцца, з аднаго боку, самыя таленавітыя, з другога боку, тыя, хто марыць аб эканоміцы, хто мае эканамічны стыль мыслення.

Доказам сучаснасці факультэта з'яўляецца нават спосаб святкавання яго дня нараджэння. Самі студэнты арганізавалі ў клубе "Рэактар" начную дыскатэку з мноствам конкурсаў, намінацый, уручэненнем выкладчыкам эканамічных Оскараў. Свядома гэтае мерапрыемства было карпаратыўным, мы не запрашалі гасцей. Таму што наш дэвіз — пойдзем па жыцці разам. 5 мая на факультэце пройдзе дзень эканаміста, на які мы запросім шмат гасцей і ў першую чаргу тых, хто атрымаў адукацыю эканаміста ў БДУ.

Я спадзяюся, што год за годам кожную вясну мы будзем сустракаць усё больш адпавядаючымі часу, і ўсё больш прадпрыемстваў, арганізацый будзе ведаць, што лепшыя кадры эканамістаў рыхтуюцца ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. А будзе створана ў эканоміцы крытычная маса прафесійных эканамістаў — стане лепшым наша жыццё.

*Таццяна КУХАРЧУК*

# Праграмісты БДУ едуць у Фларыду

*Як ужо паведамляў "Беларускі універсітэт", увосень мінулага года каманда БДУ бліскуча выступіла ў Санкт-Пецярбургу на паўфінальных спаборніцтвах па праграмаванні і напрыканцы сакавіка іх чакае фінальны тур у ЗША. Усё гэта мы толькі караценька нагадваем, таму што нашы чытачы мелі магчымасць чытаць рэпартажы пра поспехі студэнтаў факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі на старонках "Беларускага універсітэта". А зараз мы прапануем зазірнуць за кулісы спаборніцтваў і пазнаёміцца бліжэй са студэнтамі каманды БДУ па праграмаванні.*

## КРЫХУ ГІСТОРЫІ

Міжнародная арганізацыя Association for Computing Machinery (ACM) з'яўляецца найбольш аўтарытэтнай у свеце арганізацыяй у сферы камп'ютэраў, што аб'ядноўвае больш за 80000 сваіх членаў — людзей розных прафесій, якія займаюцца праблемамі камп'ютэрнага свету. Штогод ACM праводзіць фінал каманднага чэмпіянату свету па праграмаванні сярод студэнтаў, пераможцы якога ўзнагароджваюцца сумесна з лаўрэатамі розных навуковых прэмій на традыцыйным штогадовым урачыстым зборы ACM. Камандны чэмпіянат свету сярод студэнтаў праводзіцца з 1977 года. Схема арганізацыі чэмпіянату ўключае тры этапы: чвэрць фіналу, паўфінал і фінал. Каманды-пераможцы рэгіянальных груп выходзяць у фінал і разыгрываюць званне чэмпіёна свету, Еўропы, Паўночнай Амерыкі і іншых кантынентаў.

На першы погляд здаецца, што гэтыя спаборніцтвы адносяцца да сферы "высокага мастацтва", якое амаль не мае нічога агульнага з рэальным жыццём. Аднак вынікі гэтых інтэлектуальных гульняў сусветнай праграмісцкай эліты ўяўляюць інтарэс для больш шырокага кола людзей, паколькі працэс фарміравання і падрыхтоўкі каманд грунтуецца на ўсёй адукацыйнай, навуковай, прамысловай, культурнай інфраструктуры краіны.

Не выпадкова генеральны спонсар чэмпіянату свету 1992/93 —1996/97 гг. — знакамітая камп'ютэрная карпарацыя Microsoft затраціла на арганізацыю больш за 27 мільёнаў долараў. Пачынаючы з сезона 1997/98 гг. генеральным спонсарам чэмпіянату з'яўляецца сусветна вядомая карпарацыя IBM.

**Людміла Уладзіміраўна ПЕЎЗНЕР, дацэнт кафедры МЗ ЭВМ, дырэктар спаборніцтваў Заходняга рэгіёну:**

— Вядома ж, чэмпіянат свету — гэта вельмі высокі ўзровень, і далёка не кожны можа паспрабаваць там свае сілы. Але гэта не прычына для адчаю. Калі табе вельмі падабаецца інфарматыка, то можна паказаць сябе ў БДУ. Існуе некалькі ўзроўняў гэтых спаборніцтваў. Першы — напачатку сакавіка праходзіць факультэцкая алімпіяда па інфарматыцы, у якой прымае ўдзел 16—20 каманд факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі. Другі ўзровень прыпадае на канец сакавіка — пачатак красавіка. Гэта універсітэцкая алімпіяда па праграмаванні сярод профільных факультэтаў: ФПМІ, механіка-матэматычны, фізічны і радыёфізікі і электронікі. Тут выступаюць як каманды, якія прадстаўляюць якінебудзь адзін факультэт, так і аб'яднаныя каманды. Студэнтам іншых факультэтаў прыходзіцца вельмі цяжка, бо звычайна першыя сем—дзесяць месцаў займаюць каманды ФПМІ. Наступны ўзровень спаборніцтваў стартуе ў кастрычніку — рэспубліканская алімпіяда, спонсар якой Міністэрства адукацыі і Беларускі дзяржаўны універсітэт. У 1998 годзе Беларусі было дадзена права арганізаваць на базе БДУ чвэрцьфінальны рэгіён. Таму апошнім часам мы паралельна праводзім і чэмпіянат Беларусі, і чвэрцьфінал чэмпіянату свету.

## ЗАХОДНІ РЭГІЁН

Беларускія каманды пачалі ўдзельнічаць у гэтых чэмпіянатах не так даўно — толькі з 1995/96 гадоў. Каманды Беларускага дзяржаўнага універсітэта за гэты час дабіліся вялікіх поспехаў (з 13-га месца падняліся на 2-е). Высокія вынікі беларускіх каманд, а асабліва БДУ, былі станоўча адзначаны арганізацыйным камітэтам чэмпіянату, і ў 1998 годзе было дадзена права арганізаваць на базе Беларускага дзяржаўнага універсітэта новы чвэрцьфінальны рэгіён.

Першыя спаборніцтвы 1/4 новага Заходняга рэгіёну каманднага чэмпіянату свету па праграмаванні сярод студэнтаў адбыліся ў кастрычніку 1998 года. У спаборніцтвах узялі ўдзел 20 каманд вядучых ВНУ рэспублікі. Пераможцы гэтых спаборніцтваў атрымалі пуцёўкі на паўфінальныя спаборніцтвы Паўночна-Заходняга Еўрапейскага рэгіёну (Санкт-Пецярбург).

## САМЫЯ РАЗУМНЫЯ

Сярод членаў каманды БДУ па праграмаванні — Сяргей Сцепанцоў, Уладзімір Танковіч і капітан каманды Іван Міхневіч. Кожны з іх пасябраваў з інфарматыкай яшчэ ў школе. Яны неаднаразова былі пераможцамі і дыпламантамі алімпіяд па інфарматыцы на розных узроўнях.

Уладзімір Танковіч — маладзейшы за ўсіх, ён толькі другі год студэнт БДУ, ды і ў камандзе толькі год. Але гэта не азначае, што ён слабейшы за іншых. Уладзімір хутка ўліўся ў каманду і зараз ён роўны сярод роўных. Прыкладам гэтаму можа служыць выпадак на паўфінале ў Санкт-Пецярбургу. Спаборніцтвы праходзяць так, што два чалавекі з каманды працуюць сумесна на камп'ютэры, а трэці — адзін рашае больш складаныя задачы на аркушы паперы. Як больш вопытныя, Сяргей і Іван павінны былі працаваць разам. Але так атрымалася, што менавіта Уладзімір працаваў у пары са сваім капітанам, а Сяргей працаваў адзін. І трэба сказаць, што першае "баявое хрышчэнне" на такім высокім узроўні ўдалося.

Гэта першы сезон для каманды ў такім складзе. Ён жа будзе і апошнім. Справа ў тым, што па правілах спаборніцтваў у камандзе можа быць толькі адзін пяцікурснік, а Іван Міхневіч і Сяргей Сцепанцоў зараз на чацвёртым. Што будзе ў наступным годзе? Магчыма, хтосьці з іх пакіне каманду і будзе выступаць у складзе новай. Але капітан зазначыў, што ён зусім не ўпэўнены, што тая новая будзе мацнейшая за гэту, таму, магчыма, ён назаўсёды пакіне спаборніцтвы. Але пра будучыню хлопцы пакуль не думаюць. У іх хапае спраў у сённяшнім дні. І самая галоўная справа — чэмпіянат свету.

**Павел Аляксеевіч МАНДРЫК, дэкан факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі:**

— Прыемна зазначыць, што нашы хлопцы змагаюцца на адным ўзроўні з лепшымі ВНУ свету. Ужо тое, што ў нас за мяжой не пытаюць, што такое Беларусь і дзе яна знаходзіцца, дасягненне не малое. Калі вяртацца да вынікаў паўфіналу, то мы пакінулі за спіною нават чатыры каманды Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта і заваявалі дзве пуцёўкі на фінал у Фларыду. Але па правілах толькі адна каманда мае права прадстаўляць Беларусь у фінале, таму туды і едуць мацнейшыя. Чэмпіянат свету — справа на толькі універсітэта, але і ўсёй краіны. Гэта кірунак адукацыі Рэспублікі Беларусь.

*Вольга КУЛІКОВА*



# У ВОЛЬНЫ АД ВУЧОБЫ ЧАС

У БДУ ужо больш за два гады працуе Цэнтр занятасці моладзі. Асноўнай задачай Цэнтра з'яўляецца падрыхтоўка моладзі да самастойнага выхаду на рынак працы і паляпшэнне яе матэрыяльнага становішча. Цэнтр занятасці плённа супрацоўнічае з цэнтрамі занятасці насельніцтва, прадпрыемствамі і арганізацыямі Мінска, дапамагае ў працаўладкаванні як на пастаянную, так і часовую працу. Штотыднёва абнаўляецца банк вакансій розных спецыяльнасцей.

У летні перыяд Цэнтрам занятасці плануецца арганізацыя будаўнічых студэнцкіх атрадаў, якія будуць працаваць на будаўнічых аб'ектах у Мінску. Акрамя таго, ёсць канкрэтныя прапановы аб фарміраванні студэнцкіх педагагічных атрадаў для працы ў дзіцячых аздараўленчых лагерах Мінскай вобласці, будаўнічых атрадаў у Калінінградскай вобласці, сельскагаспадарчых атрадаў у Малдове.

Усіх студэнтаў, якія жадаюць працаваць у вольны ад вучобы час, чакаюць у галоўным корпусе БДУ (праспект Ф. Скарыны, 4, пакой 205).

*Міхаіл СІМАНЮКОЎ,*
*студэнт 3-га курса*
*гістарычнага факультэта*

# Положение о Комиссии по этике

## 1. Общие положения

1.1. Комиссия по этике (далее — Комиссия) является выборным общественным коллегиальным органом БГУ. Она организует свою деятельность на основе общечеловеческих моральных ценностей и в соответствии с нравственной сутью университета, нацеленной на утверждение Добра и Справедливости во благо человека и Отечества.

1.2. Работа Комиссии направлена на формирование и создание атмосферы уважительного отношения к Человеку и Делу, приоритетность и осознание каждым нравственных начал и принципов, бережное отношение к университету и поддержание его высокого статуса, формирование благоприятного морально-психологического климата в трудовых коллективах БГУ, урегулирование межличностных конфликтных отношений.

## 2. Состав и формирование Комиссии

2.1. Комиссия избирается в количестве 9 человек. В ее состав входят 6 представителей профессорско-преподавательского состава, два представителя от коллектива научных сотрудников, один представитель от профсоюзной организации сотрудников.

2.1.1. Выдвижение кандидатур от профессорско-преподавательского состава осуществляется открытым голосованием на заседаниях Ученых советов факультетов, РИВШ, ИПК, колледжа и лицея. Каждое подразделение может выдвинуть не более одной кандидатуры. Выписка из протокола заседания соответствующего Ученого совета подается ученому секретарю Ученого Совета БГУ в течение трех дней. Список выдвинутых кандидатур и их краткие биографические данные публикуются в газете "Беларускі універсітэт". Все выдвинутые кандидатуры от профессорско-преподавательского состава проходят поддержку на заседаниях указанных выше Ученых советов путем тайного голосования. Выдвинутая кандидатура считается поддержанной, если она получила не менее 3/4 голосов от участвующих в голосовании. Сведения о результатах поддержки кандидатур подаются ученому секретарю Ученого совета БГУ в трехдневный срок. К избранию допускаются кандидатуры, получившие хотя бы одну поддержку.

2.1.2. Выдвижение и поддержка кандидатур от коллектива научных сотрудников проводятся по схеме п. 2.1.1. на заседаниях Ученых советов НИИ, Национальных центров, НИЧ.

2.1.3. Выдвижение кандидатур от профсоюзной организации проводится на Объединенном собрании профсоюзного комитета и профсоюзных бюро структурных подразделений университета. Выдвижение кандидатур осуществляется тайным голосованием. На собрании должно присутствовать не менее 2/3 членов профсоюзного комитета и профсоюзных бюро. Выдвинутыми считаются кандидатуры, за которые проголосовало не менее 3/4 от участвующих в голосовании.

2.2. Комиссия избирается Ученым советом университета тайным голосованием персонально по каждой кандидатуре. Избранными считаются те 9 кандидатур в соответствии с квотами п. 2.1. настоящего положения, которые набрали большее количество голосов, но не менее 3/4 от участвующих в голосовании. При этом на данном заседании Ученого совета должно присутствовать не менее 2/3 от его списочного состава.

2.3. Руководит работой Комиссии председатель, избираемый тайным голосованием Объединенным советом университета. Выдвижение кандидатуры председателя осуществляется Комиссией на своем первом заседании. При избрании на заседании Объединенного совета должно присутствовать не менее 2/3 его списочного состава. Кандидатура председателя является избранной, если она получила не менее 3/4 голосов от числа участвующих в голосовании.

Текущую организационную деятельность Комиссии осуществляет секретарь, назначаемый председателем Комиссии из числа ее членов.

# Положение об Объединенном совете Белорусского государственного университета

*Утверждено*
*на заседании Ученого совета БГУ*
*21 декабря 1999 г., протокол №1*

### *1. Общие положения*

1.1. Объединенный совет Белорусского государственного университета — высший коллегиальный орган БГУ. Решения Объединенного совета БГУ обязательны для всех структурных подразделений, подведомственных организаций, членов коллектива БГУ.

1.2. Председателем Объединенного совета является ректор БГУ, осуществляющий общее руководство его деятельностью.

1.3. Заместителем председателя Объединенного совета является председатель комиссии БГУ по этике, избираемый Объединенным советом.

1.4. Текущую деятельность Объединенного совета обеспечивает секретарь, избираемый Объединенным советом из числа своих членов.

1.5. Срок полномочий Объединенного совета — пять лет.

1.6. Объединенный совет в своей деятельности руководствуется Уставом БГУ и настоящим Положением.

### *2. Состав и формирование Объединенного совета БГУ*

2.1. В состав Объединенного совета входят члены Ученого совета Белгосуниверситета, члены Ученых советов (советов) структурных подразделений БГУ, члены совета по научно-исследовательской работе студентов и аспирантов (НИРСА) и студенческого совета старост.

2.2. В состав Объединенного совета входят руководители структурных подразделений и подведомственных организаций, руководители студенческих организаций.

2.3. В состав Объединенного совета входят также члены трудовых коллективов, не указанных в п.2.1. Они избираются на общих собраниях открытым голосованием простым большинством по квоте представительства 1:50.

### *3. Права и функции Объединенного совета БГУ*

3.1. В соответствии с Уставом БГУ Объединенный совет БГУ:

- определяет перспективные направления развития БГУ;
- утверждает план социально-экономического развития БГУ;
- вносит в установленном порядке предложения по реорганизации БГУ, изменению его структуры и Устава;
- избирает ректора БГУ с последующим представлением его кандидатуры на утверждение Президенту Республики Беларусь;
- квалифицированным большинством в две трети голосов от своего списочного состава принимает решение о внесении в установленном порядке предложений Президенту Республики Беларусь об освобождении от должности ректора БГУ.

3.2. Член Объединенного совета БГУ имеет право вносить предложения по работе этого совета, направлять связанные с компетенцией Объединенного совета запросы должностным лицам БГУ, которые обязаны давать ответ на этот запрос в месячный срок.

### *4. Регламент работы Объединенного совета БГУ*

4.1. Заседания Объединенного совета проводятся по мере необходимости. Заседание Объединенного совета может быть созвано по решению ректора или Ученого совета БГУ, или же по инициативе не менее чем 1/3 членов Объединенного совета БГУ. В последнем случае дату проведения заседания Объединенного совета БГУ определяет секретарь Объединенного совета БГУ. Эта дата должна быть не позднее, чем через месяц после получения им соответствующего заявления.

4.2. Организацию и проведение заседания Объединенного совета, связанного с избранием (освобождением от должности) ректора БГУ, осуществляет заместитель председателя.

4.3. Заседания Объединенного совета считаются правомочными, если в них принимают участие не менее двух третей от его полного списочного состава.

4.4. Решения Объединенного совета, не связанные с избранием (освобождением от должности) ректора БГУ, принимаются открытым голосованием простым большинством голосов от присутствующих.

4.5. При принятии решения об избрании (освобождении от должности) ректора БГУ проводится тайное голосование через бюллетени.

Тайное голосование может быть проведено и по другим вопросам, если за это решение проголосует большинство членов Объединенного совета.

### *5. Заключительные положения*

5.1. Решение Объединенного совета БГУ оформляется протоколом и вступает в силу с момента его подписания председателем заседания в десятидневный срок.

5.2. Изменения и дополнения в Положение об Объединенном совете принимаются квалифицированным большинством (2/3 голосов от списочного состава).

5.3. Настоящее положение вступает в силу с момента его утверждения Объединенным советом БГУ.

*Утверждено на заседании Ученого совета БГУ 21 декабря 1999 г., протокол № 1*

# Белорусского государственного университета

### 3. Личные гарантии членов Комиссии

3.1. Члены Комиссии не могут быть уволены из университета по инициативе администрации без согласия 3/4 членов Ученого совета БГУ, при условии присутствия на заседании не менее 2/3 его списочного состава.

3.2. Члены Комиссии, ранее входившие в ее состав и по различным основаниям вышедшие из ее состава и работающие в БГУ, в течение 3 лет не могут быть уволены из университета по инициативе администрации без согласия 3/4 Ученого совета БГУ, при условии присутствия на заседании не менее 2/3 его списочного состава.

3.3. Вмешательство в работу Комиссии со стороны администрации, структурных подразделений, членов коллектива не допускается.

### 4. Принципы работы Комиссии

4.1. В своей деятельности Комиссия руководствуется Уставом БГУ, общечеловеческими нравственными принципами, нормами, ценностями.

4.2. Право на обращение в Комиссию для защиты чести и достоинства имеет любой член коллектива БГУ.

### 5. Регламент работы Комиссии

5.1. Срок полномочий Комиссии 7 лет с момента принятия ее членами присяги на Объединенном совете.

5.2. Текст присяги:

***Я, член Комиссии по этике Белорусского государственного университета, облеченный высочайшим доверием университетского сообщества и данными мне полномочиями, перед лицом Объединенного совета принимаю присягу на верность исполняемому долгу и торжественно клянусь***

***- в своей деятельности на посту члена Комиссии руководствоваться только принципами моральных идеалов и нравственности, нацеленных на постижение Истины и утверждение Добра и Справедливости во благо человека;***

***- во всех своих решениях, в которых будет даваться оценка человеческим поступкам, исходить из того, что праведное решение в лице одного есть высшая моральная норма в лице всех;***

***- сохранять полную конфиденциальность полученной информации;***

***- во всем исходить из высших этических норм как в отношениях с коллегами по Комиссии, так и с коллегами по работе;***

***- в случае нарушения мной этой торжественной клятвы, я вверяю свою судьбу избравшему меня университетскому сообществу и готов принять в отношении себя любое его решение.***

5.3. Заседания Комиссии являются конфиденциальными. Решение по каждому выносимому вопросу принимается на основе консенсуса. Обязательное количество членов Комиссии, необходимое для принятия решения по рассматриваемым вопросам, должно быть не менее 7 человек.

5.4. В случае длительной болезни одного или нескольких членов Комиссии, или по личной мотивированной просьбе о выходе из нее решение Комиссии выносится на Ученый совет БГУ, на основании которого проводятся довыборы на места выбывших членов Комиссии. Та же процедура проводится и в случае нарушения членом Комиссии присяги.

### 6. Заключительные положения

6.1. Комиссия дает нравственную оценку действиям любого члена коллектива БГУ.

В зависимости от обстоятельств и содержания конфликта Комиссия самостоятельно принимает решение о конкретных формах оценки и средствах обнародования (оглашения) своего заключения.

6.2. Решения Комиссии являются окончательными и не могут быть оспорены администрацией, коллегиальными и иными структурами университета.

Решения Комиссии являются обязательными для всех членов коллектива БГУ.

---

# Положение об избрании (освобождении от должности) ректора Белорусского государственного университета

*Утверждено на заседании Ученого совета БГУ 21 декабря 1999 г., протокол №1*

### *1. Общие положения*

1.1. Ректор БГУ избирается Объединенным советом Белгосуниверситета с последующим представлением его кандидатуры на утверждение Президенту Республики Беларусь. Срок полномочий ректора – пять лет.

1.2. Решение о внесении в установленном порядке предложений Президенту Республики Беларусь об освобождении от должности ректора БГУ принимает Объединенный совет БГУ тайным голосованием квалифицированным большинством в две трети голосов от своего списочного состава.

1.3. Решение об объявлении выборов ректора и дате их проведения принимает Ученый совет БГУ. Дата выборов должна быть не раньше, чем через месяц после даты объявления выборов.

### *2. Выдвижение кандидатов на должность ректора БГУ и обсуждение их программ*

2.1. Кандидатуры на должность ректора БГУ выдвигаются из числа профессоров (докторов наук), имеющих стаж научно-педагогической работы в БГУ не менее 5 лет на штатных должностях и опыт руководящей работы.

2.2. Кандидатура на должность ректора БГУ может быть выдвинута путем тайного голосования Учеными советами (советами) подразделений БГУ, а также по инициативе членов Ученого совета БГУ в количестве не менее 1/3 от списочного состава.

2.3. Выдвижение кандидатур проводится за 20 дней до назначенной даты выборов. Выписка из протокола заседания соответствующего Ученого совета или заявление группы членов Ученого совета БГУ о выдвижении кандидатуры на должность ректора БГУ вместе с обоснованием выдвижения и письменным согласием кандидата о баллотировании на должность ректора подаются секретарю Объединенного совета БГУ не позднее чем за 15 дней до даты выборов.

2.4. Газета "Беларускі універсітэт" в специальном выпуске за 10 дней до выборов публикует список выдвинутых кандидатов на должность ректора БГУ и их биографические данные с указанием Ученого совета (Ученых советов) или полного списка группы членов Ученого совета БГУ, выдвинувших данного кандидата.

2.5. Каждый кандидат имеет право на публикацию в газете "Беларускі універсітэт" своей программы и на проведение агитационной работы. Руководители структурных подразделений и подведомственных организаций обязаны оказывать содействие в организации и проведении встреч кандидатов на должность ректора БГУ с членами их коллективов.

2.6. Координацию проведения предвыборной кампании на должность ректора БГУ осуществляет комиссия БГУ по этике, которая затем представляет Объединенному совету соответствующее заключение.

### *3. Выборы ректора БГУ*

3.1. Выборы ректора БГУ осуществляются на заседании Объединенного совета БГУ тайным голосованием. В избирательные бюллетени включаются фамилии и инициалы всех выдвинутых кандидатов на должность ректора в алфавитном порядке. Избирательные бюллетени готовят комиссия БГУ по этике совместно с секретарем Объединенного совета БГУ. Кандидаты на должность ректора на заседании Объединенного совета кратко излагают свои программы.

3.2. При голосовании член Объединенного совета может поддержать не более одной кандидатуры. Бюллетени, в которых оставлено две или более кандидатур, считаются недействительными. Избранным считается кандидат, набравший более половины голосов от присутствующих.

3.3. В случае, когда в бюллетени включено более двух кандидатов, и ни один из них не набрал более половины голосов, проводится второй тур голосования по двум кандидатурам, набравшим наибольшее число голосов в первом туре.

3.4. В случае, если ни один из кандидатов не избран, проводятся повторные выборы в соответствии с п. 2 и п. 3 настоящего Положения. Дата выборов может быть назначена на этом же заседании Объединенного совета БГУ. Повторное выдвижение на данных выборах одной и той же кандидатуры не допускается.

### *4. Освобождение от должности ректора БГУ*

4.1. Вопрос о досрочном освобождении от должности ректора БГУ выносится на заседание Объединенного совета БГУ по инициативе не менее чем 1/3 членов Объединенного совета БГУ.

4.2. Дату проведения заседания Объединенного совета БГУ по этой повестке дня определяет секретарь. Эта дата должна быть не позднее чем через месяц после получения соответствующего заявления. Бюллетени для тайного голосования готовят комиссия БГУ по этике совместно с секретарем Объединенного совета БГУ.

ПОСТФАКТУМ

## АБРАНЫ НОВЫ САКРАТАР БСМ БДУ

10 сакавіка адбыўся сход пярвічнай арганізацыі Беларускага саюза моладзі БДУ. У ім прыняла ўдзел першы сакратар Мінскага гарадскога камітэта БСМ М. Мосіна. Абмяркоўваліся пытанні развіцця і перспектыўнай дзейнасці арганізацыі. М. Мосіна падзялілася інфармацыяй аб праектах, якія рэалізуюцца БСМ, адзін з якіх — "Інтэрнэт-кафэ", гэта сумесны праект з UNISEF; а таксама арганізацыя летніх студэнцкіх атрадаў для працы ў блізкім і далёкім замежжы, фестываль студэнцкай творчасці, турыстычныя злёты. Дэлегаты і госці схода заслухалі выступленні прадстаўнікоў факультэтаў. Новым сакратаром камітэта БСМ БДУ быў абраны Вадзім Гігін.

*Аляксандр ЛАБКОЎ*

АБ'ЯВЫ

## НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧЫ ІНСТЫТУТ ПРЫКЛАДНЫХ ФІЗІЧНЫХ ПРАБЛЕМ ІМЯ А.Н. СЕЎЧАНКІ

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад:**

**Вядучага навуковага супрацоўніка** па спецыяльнасці фізіка цвёрдага цела — 1;
**Навуковых супрацоўнікаў** па спецыяльнасцях:
— оптыка — 1;
— інфармацыйна-вымяральныя сістэмы — 1;
— паўправадніковая электроніка — 1.
Тэрмін конкурсу — адзін месяц са дня апублікавання аб'явы.
Дакументы накіроўваць на адрас: г. Мінск, вул. Курчатава, 7. Тэл. 277-56-17, 277-48-43.

## РЭКТАРАТ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:**

**Старшага навуковага супрацоўніка** Навукова-даследчай лабараторыі інфармацыйных рэсурсаў і камунікацый — 1;
**Вядучага навуковага супрацоўніка** Навукова-даследчай лабараторыі біяфізікі і біятэхналогіі — 1.
**Навуковага супрацоўніка** Навукова-даследчай лабараторыі гідраэкалогіі — 2.
Тэрмін конкурсу — адзін месяц са дня апублікавання аб'явы.
Адрас: 220050, г. Мінск, Белдзяржуніверсітэт, вул. Бабруйская, 9, Навукова-даследчая частка, упраўленне кадраў, пакоі 406, 407, тэл. 226-47-64.

## НАЦЫЯНАЛЬНЫ ЦЭНТР ФІЗІКІ ЧАСЦІЦ І ВЫСОКІХ ЭНЕРГІЙ БДУ (НЦ ФЧВЭ)

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад:**

**Загадчыка лабараторыі** электронных метадаў і сродкаў эксперыменту;
**Старшага навуковага супрацоўніка** лабараторыі электронных метадаў і сродкаў эксперыменту — 2 чалавекі;
**Старшага навуковага супрацоўніка** лабараторыі фундаментальных узаемадзеянняў;
**Старшага навуковага супрацоўніка** лабараторыі фізікі часціц.
Тэрмін падачы дакументаў — адзін месяц са дня апублікавання аб'явы.
Адрас: 220040, г. Мінск, вул. Багдановіча, 153. Тэл. 232-60-34.

## НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧЫ ІНСТЫТУТ ФІЗІКА-ХІМІЧНЫХ ПРАБЛЕМ БДУ

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад:**

**Навуковага супрацоўніка** лабараторыі тэрмадынамікі арганічных рэчываў;
**Малодшага навуковага супрацоўніка** лабараторыі лекавых сродкаў на аснове мадыфікаваных полісахарыдаў.
Тэрмін конкурсу — адзін месяц са дня апублікавання аб'явы.
Дакументы прымаюцца па адрасе: 220050, г. Мінск, вул. Ленінградская, 14, аддзел кадраў НДІ ФХП БДУ.

СПРАВАЗДАЧЫ

## Педагагічная практыка географаў

Ці лёгка працаваць настаўнікам геаграфіі ў прафесіянальным плане? Лёгка, калі вы скончылі геаграфічны факультэт БДУ, на якім студэнты атрымліваюць трывалыя тэарэтычныя веды і неабходныя практычныя навыкі.

Будучыя выпускнікі 2000 года запэўнілі ў гэтым усіх жадаючых, прадэманстраваўшы сваю прафесіянальную падрыхтоўку падчас педагагічнай практыкі, што праходзіла з 8 лістапада па 31 снежня 1999 года. Студэнты праходзілі практыку ў 18 навучальных установах (з іх 12 — у Мінску) і атрымалі высокую ацэнку не толькі з боку групавых кіраўнікоў і кантралюючых органаў (выкладчыкаў кафедраў педагогікі і псіхалогіі), але і ад настаўнікаў і непасрэдна вучняў, з якімі студэнты працавалі. Вялікую ўдзячнасць атрымалі студэнты ад сваіх вучняў за цікавыя, пазнавальныя ўрокі і нестандартныя пазакласныя мерапрыемствы (віктарыны, гульні, конкурсы, прэс-канферэнцыі і г.д.). Недарма прайшлі для практыкантаў курсы "Методыка выкладання геаграфіі", "Арганізацыя пазакласнай працы", "Сучасныя праблемы кіравання школай" і іншыя. Практычна ўсе настаўнікі і кіраўнікі педпрактыкі адзначылі глыбокае веданне практыкантамі прадмета і шырокі кругагляд, іх уменне правільна арганізаваць навучальна-адукацыйны працэс. А калі ўзнікалі нейкія пытанні, заўсёды можна было звярнуцца па дапамогу да кіраўнікоў па практыцы. Як вынік, 87% студэнтаў атрымалі адзнаку "выдатна" і толькі 13% — адзнаку "добра". Некаторыя студэнты атрымалі запрашэнне на працаўладкаванне, а Юлія Макаранка, Таццяна Карніловіч і Алена Барысевіч ужо прыступілі да працы ў школах, дзе яны праходзілі педпрактыку.

Спецыяльна для падвядзення вынікаў практыкі была арганізавана канферэнцыя. На ёй былі заслуханы даклады студэнтаў па пытаннях удасканалення выкладання геаграфіі ў школе, яго сучаснага стану, а таксама пра вопыт работы лепшых педагогаў школ, у якіх праходзіла педагагічная практыка. Сярод гэтых дакладаў неабходна адзначыць выступленні Ірыны Балоцінай ("Праблемы пазакласнай работы па геаграфіі (на прыкладзе СШ №1)"), Таццяны Азаронак ("Сучасны ўрок па геаграфіі: патрабаванні да яго і праблемы арганізацыі (на прыкладзе СШ №19)"), Сяргея Кучкова ("Экалагічная падрыхтоўка школьнікаў (на прыкладзе краязнаўчай работы ў СШ №160)"), Аляксандра Кудраўцава ("Эканамічная падрыхтоўка школьнікаў пры вывучэнні геаграфіі (на прыкладзе СШ №163)"), у якіх прагучалі розныя цікавыя прапановы, заўвагі і парады па асобных пытаннях методыкі выкладання і зместу школьнай геаграфіі.

Будзем спадзявацца, што мы апраўдаем ускладзеныя на нас надзеі і станем дастойнай зменай нашых выкладчыкаў і настаўнікаў.

*Аляксандр КУДРАЎЦАЎ,*
*студэнт геаграфічнага факультэта*

ЗДАРЭННЕ

## ПРЫЧЫНА ТРАЎМАТЫЗМУ – БЕСТУРБОТНАСЦЬ

Праверка паказвае, што праблемы аховы працы не ўпісваюцца ў сучасныя эканамічныя і гаспадарчыя адносіны і ўсё больш адыходзяць у катэгорыю другарадных задач, што фарміруе небяспечную тэндэнцыю абыякавасці да гэтых важных пытанняў.

Так, 13 кастрычніка мінулага года сталяр 5 разраду А.Р. Івашчанка падчас апрацоўкі дошкі на фугавальным станку СФА-4 атрымаў траўму правай кісці.

Камісія, якая расследавала дадзены няшчасны выпадак, выявіла, што сталяр атрымаў вытворчую траўму з-за заблакіраванага нажавога вала. Былі парушаны патрабаванні па ахове працы. Затраты па кампенсацыі траўмы з улікам штрафных санкцый склалі 70 мільёнаў недэнамінаваных рублёў.

Прыведзены прыклад няхай будзе навукай для тых, хто з-за сваёй спешкі, неабдуманасці дзеянняў і вынікаў выконваюць працу, парушаючы правілы бяспекі.

Пытанні стварэння здаровых і бяспечных умоў працы павінны стаць галоўнымі для кіраўнікоў структурных падраздзяленняў Белдзяржуніверсітэта.

*А.Р. СЕМЯНЮК,*
*галоўны дзяржаўны інспектар працы*

ВЫСТАВЫ

# КАЗКА ЧАРОЎНАГА СВЕТУ КАМЯНЁЎ

*Яшчэ адна "Каменная казка" ажыве з 24 па 26 сакавіка на геаграфічным факультэце БДУ. Ладзіцца яна ўжо ў адзінаццаты раз і прысвячаецца Дню геолага. Галоўнымі казачнымі героямі будуць самацветы. Яны захапляюць, радасна здзіўляюць, зачароўваюць векавечнай гармоніяй і дасканаласцю. Так ужо склалася, што са старажытных часоў камень служыў чалавеку, упрыгожваў, лячыў, таму і пранесла чалавецтва праз вякі і тысячагоддзі любоў да каменю. Менавіта ў гэтыя дні з'едуцца ў Белдзяржуніверсітэт калекцыянеры, майстры з Беларусі, Расіі, Украіны і іншых краін на Міжнародную мінералагічную выставу.*

На такіх выставах заўжды зіхаціць і саграваe сэрца сонечны камень — бурштын, які прадстаўляюць Калінінградскі бурштынавы камбінат і прафесар А.А. Багдасараў з Брэста. Майскай зялянінай вабіць малахіт, прывезены ў Мінск з далёкага Конга, шмат каму падабаецца гэты камень. Амаль на кожнай выставе квітнеюць каменныя ружы з гіпсу і кальцыту, струменіцца бэзавы чараіт, заварожвае апалавы позірк. Штогод дэманструюць юныя геолагі студыі "Карат" з Гродна прыгожыя аметысты, кварцы, яшмы, якія яны самі прывезлі з Урала, Кольскага паўвострава і іншых месцаў. Уражвае і майстэрства студыйцаў на чале з У.А. Жданюком, якія вырабляюць ўпрыгожванні, пано, вазы, гадзіннікі ...

Жаданы госць нашай выставы — майстар народнай творчасці, член гільдыі ювеліраў Латвіі А.Ф. Сяржант. Яго калекцыю чакаюць у БДУ. Ён падарыў Музею землязнаўства цудоўны мастацкі твор — "Сімвал ведаў", прысвечаны 75-годдзю універсітэта. Багацейшую мінералагічную калекцыю прадстаўляе мясцовы занальна-турысцкі спартыўны клуб "Мерыдыян", што ў Бабруйску. Не менш цікавыя ўзоры камянёў і вырабы з іх прывозяць з Урала, Сібіры, Казахстана і іншых рэгіёнаў.

Кола ўдзельнікаў шырокае: на выставе можна сустрэць керамістаў, майстроў-разьбяроў па дрэве і інш. А каго цікавяць кнігі па мінералогіі, петраграфіі, альбо папулярныя выданні пра камяні, то іх тут можна набыць у прыватных калекцыянераў. Таксама можна пазнаёміцца з абсталяваннем для распілоўкі камянёў, ультрагукавымі інструментамі для абточвання крышталёў, для прашыўкі адтулін і гравіравальных работ.

Хто хоча набыць свой талісман, свой "шчаслівы" камень месяца, то нагадаем іх.

**Студзень** — гранат, гіяцынт, ружовы кварц, сапфір, радаліт, горны хрусталь.

**Люты** — аметыст, турмалін, онікс, сапфір, хрызаліт, скапаліт, александрыт, чараіт і гіяцынт.

**Сакавік** — яшма, аквамарын, геліятроп, алмаз, аметыст, хрызаліт, александрыт, карал, турмалін і амазаніт.

**Красавік** — алмаз, сапфір, горны хрусталь, цыркон, лазурыт, бурштын, аметыст, кашэчае вока, агат і яшма.

**Май** — ізумруд, агат, хрызапраз, халцэдон, турмалін, берыл, гранат-дэмантоід, малахіт, тапаз і нефрыт.

**Чэрвень** — жэмчуг, агат, ізумруд, месяцовы камень, александрыт, кашэчае вока, халцэдон, малахіт, гранат, берыл і апал.

**Ліпень** — рубін, сердалік, онікс, ізумруд, горны хрусталь, апал, сардонікс, біруза і шпінэль.

**Жнівень** — сардонікс, хрызаліт, сердалік, месяцовы камень, онікс, кашэчае вока, рубін, турмалін, сапфір, яшма, зоркавы сапфір, аванцюрын, александрыт, нефрыт, гранат-грасуляр і ізумруд.

**Верасень** — сапфір, хрызаліт, лазурыт, яшма, жэмчуг і алмаз.



**Кастрычнік** — апал, аквамарын, турмалін, рубін, алмаз, яшма і кашэчае вока.

**Лістапад** — тапаз, тыгровае вока, аквамарын, горны хрусталь, бурштын, геліядор, сердалік, біруза, марыён, цытрын, гіяцынт і берыл.

**Снежань** — біруза, рубін, хрызапраз, цыркон, лазурыт, плазма, онікс, апал, зоркавыя камяні, тапаз і блакітны цыркон.

Шаноўныя выкладчыкі, супрацоўнікі, студэнты, прыходзьце на выставу, здзіўляйцеся і зачароўвайцеся прыгажосцю прыроды і створанай рукамі чалавека дасканаласцю. Вы будзеце мець магчымасць набыць упадабаныя ўпрыгожванні, сувеніры. Ні ў якім разе не купляйце камень, які вам не вельмі падабаецца, — нават калі ўсе гараскопы раяць, што гэта ваш талісман. Камяні, як і людзі, непаўторныя.

*Валянціна СМАЛЯКОВА,*
*геолаг музея землязнаўства Белдзяржуніверсітэта*

СПАБОРНІЦТВЫ

# МУЖЧЫНЫ «ВЫСВЯТЛЯЛІ АДНОСІНЫ»

У Дзень абаронцы Айчыны на геаграфічным факультэце былі наладжаны мерапрыемствы, прысвечаныя гэтай даце. Акрамя дыскатэкі, адбыліся спаборніцтвы пад дэвізам "Наперад, географы!". Яны ўключалі ў сабе шэраг сапраўды мужчынскіх конкурсаў: надзяванне процівагаза, адначасовая разборка—зборка аўтамата Калашнікава, штурханне 16-кілаграмовай гіры, армрэслінг, кіданне непрыстасаваных для гэтага прадметаў (запалкавай каробкі з шурупамі, мяча нязвычнай формы) у баскетбольны мяч, прысяданне на адной назе, надзяванне сарочкі з зашпільваннем усіх гузікаў і два сакрэтныя конкурсы.

У спаборніцтвах прынялі ўдзел тры каманды — "Гарачыя галовы" (3 курс), "Ілюзія" (2 курс), "Зялёныя" (1 курс). Чацвёртакурснікі сваёй каманды не выставілі, і тое, што на курсе не знайшлося трох мужчын, вельмі непрыемна ўразіла вядучага свята — намесніка дэкана па вучэбнай і выхаваўчай рабоце М.В. Кухарчыка.

Але тое, што ў спаборніцтвах прынялі ўдзел не чатыры, а тры каманды, нікольки не пагоршыла ўражання. Страсці, што кіпелі на сцэне, перадаваліся гледачам і кожны "хварэў" за сваіх. А некаторыя нават не баяліся пярэчыць журы і вядучаму, і ў знак пратэсту супраць несправядлівых, на іх думку, адносін да іх каманды пакідаць залу.

Калі пасля першых двух конкурсаў лідэрства захапіла каманда "Ілюзія", то падчас трэцяга і чацвёртага "Гарачым галовам" удалося дагнаць сапернікаў. Але ў наступных двух конкурсах сваё жаданне перамагчы паказалі "Зялёныя". У выніку перад апошнім конкурсам надзявання сарочкі нельга было сказаць, хто стане пераможцам. Ён вызначыўся на апошняй трэці дыстанцыі.

Пасля даволі цяжкага падвядзення выніку апошняга конкурсу і дыскваліфікацыі каманд першага і трэцяга курсаў у першым сакрэтным конкурсе (патрэбна было з завязанымі вачыма наліць ваду ў стакан акурат паміж двума ўзроўнямі) шалі схіліліся ў бок каманды другакурснікаў "Ілюзія". Другое месца занялі "Гарачыя галовы", якім нават не дапамагла перамога ў сакрэтным конкурсе, калі трэба было перарваць разам 70 лістоў паперы. А каманда першакурснікаў "Зялёныя" заняла трэцяе месца. Усе каманды атрымалі прызы.

Акрамя таго, журы вызначыла трох пераможцаў па намінацыях "За волю да перамогі", "За артыстычнасць" і "Самаму моцнаму". У першай намінацыі перамог капітан каманды "Зялёныя" Станіслаў Альшанецкі. Прыз за артыстызм заваяваў сваімі прысяданнямі Анатоль Карсюк ("Гарачыя галовы"). Трэці прыз журы вырашыла не прысуджваць. Аўтарытэтнае абгрунтаванне гэтаму даў старшыня журы, выкладчык фізвыхавання В.В. Харук. Ён таксама пагадзіўся даць ацэнку спаборніцтвам:

— Мы вырашылі не ўручаць прыз самаму моцнаму па прычыне таго, што ўдзельнік каманды "Гарачыя галовы" Андрэй Журо па невядомых прычынах поўнасцю не раскрыў сваю сілу. Што ж датычыцца правядзення мерапрыемства, то гледачоў у зале было хоць і многа, але значная частка студэнтаў прыйшла потым — на дыскатэку. На маю думку, такія мерапрыемствы ігнараваць нельга. Каб павысіць цікавасць да іх, патрэбна шукаць што-небудзь, каб прывабіць гледачоў. Але як "хварэла" зала, як перажывалі за сваіх калег гледачы, даказвае, што гэта ўсё ж такі добрае відовішча, бо на чыста спартыўныя спаборніцтвы ходзяць адзінкі. Таму вечарына атрымалася і дазволіла адным — паказаць сябе, другім — шчыра парадавацца іх поспеху. А мы заўсёды рады будзем дапамагчы пры арганізацыі такіх гульнёва-спартыўных мерапрыемстваў.

*Вадзім ЗУБРЫЦКІ,*
*адказны за інфармацыйны сектар маладзёжных арганізацый геафака*

# Самы таленавіты і адукаваны

*Рэдакцыя газеты "Беларускі універсітэт" працягвае знаёміць сваіх чытачоў з выдатнымі беларускімі дзеячамі, скульптуры якіх размешчаны ў дворыку універсітэцкага гарадка. На гэты раз мы раскажам пра аднаго з буйнейшых паэтаў-гуманістаў эпохі Адраджэння Міколу Гусоўскага.*



Мікола Гусоўскі — беларускі паэт-гуманіст і асветнік эпохі Адраджэння, прадстаўнік новалацінскай усходнееўрапейскай літаратурнай школы, дзеяч славянскай культуры. На жаль, біяграфічныя звесткі пра пісьменніка вельмі скупыя. Вядома, што нарадзіўся ён недзе каля 1470 года (памёр прыблізна ў 1533 годзе) у сям'і лесніка-паляўнічага каталіцкага веравызнання. Магчыма, што нарадзіўся дзесьці на тэрыторыі сучаснай Магілёўшчыны ці нават Гомельшчыны. Пазней разам з бацькам — княжацкім палясоўшчыкам — часта перабіраецца з месца на месца і, мабыць, трапляе ў заходнія ўдзельныя княствы, бліжэй да Навагрудка ці Вільні. Адукацыю атрымаў на Беларусі. Паглыбляў свае веды ў Вільні, Польшчы, Італіі. У тыя ж яшчэ маладыя гады свайго жыцця Мікола Гусоўскі трапляе пісцом у адну з каралеўскіх канцылярый. На пачатку XVI стагоддзя вялікакняжацкую канцылярыю ў Вільні ўзначальваў Эразм Вітэлій — здольны дзяржаўны дзеяч, дыпламат і служыцель культу. З паэмы "Песня пра зубра" мы даведваемся, што Гусоўскі быў васалам (слугой) у Эразма Вітэлія, калі ён узначаліў каралеўскае пасольства ў Ватыкане.

"Пратэктар" будучага паэта — пасол Э. Вітэлій — акружыў сябе здольнымі людзьмі. У яго свіце аказаўся і Мікола Гусоўскі, "самы таленавіты і самы адукаваны ўсходні славянін свайго часу ў Рыме", як яго назавуць пасля літаратуразнаўцы шэрага заходніх краін. Гэты чалавек дакажа пры выпадку, што можа стаць кімсьці большым, чым сакратаром ці нават проста слугой пасла. І такі выпадак нadарыўся.

У Рыме хтосьці з дыпламатаў світы Вітэлія заўважыў, што рымская карыда вельмі нагадвае паляванне на зуброў у яго на радзіме — "на літоўскіх аблавах". Гусоўскі згадзіўся з заўвагай, падхапіў гэту тэму і расказаў саноўнікам папскага двара пра свае былыя паляўнічыя прыгоды. "Праслухаўшы ўсё ў захапленні, — прызнаецца пасля аўтар, — сам папа Леў X, заядлы паляўнічы, звярнуўся з просьбай да каралеўскага пасла падараваць яму чучала "нябачанага рэдкага звера". Біскуп адправіў ганца ва ўладанні князя Радзівіла, а свайму сакратару, "шкаляру Міколе" загадаў "адразу ж узяцца за працу, каб успаміны свае, пераліўшы ў памер вершаваны, песняй зрабіць і пра нас, і пра нашы аблавы".

Выконваючы заказ Вітэлія для папы Льва X, які хацеў пачуць праўдзівае паэтычнае слова пра паляванне на зуброў, Гусоўскі стварыў у 1522 годзе ў Рыме свой лепшы твор "Carmen de statura feritate ac venatione bisontis" ("Песня пра постаць, дзікасць зубра і паляванне на яго").

У 1528 годзе ў Кракаве выдаў у друкарні Ераніма Віетэра паэтычны зборнік "Песня пра зубра", які складаўся з празаічнага прысвячэння, аднайменнай паэмы і 11 вершаў, напісаных пераважна ў рымскі перыяд. У прысвячэнні, адрасаваным каралеве Боне Сфорца, паэт прасіў яе ўзяць на сябе дзяржаўнае апякунства над таленавітымі і спрактыкаванымі ў навуцы і мастацтве людзьмі. Гусоўскі выступіў як выразнік перадавых грамадска-палітычных і эстэтычных поглядаў таго часу і папулярызатар гісторыі і культуры Беларусі і Літвы на сусветнай арэне, прадстаўнік рэнесансавага рэалізму.

Паэма "Песня пра зубра" адлюстроўвае не толькі знешні выгляд звера — пад сімвалам сілы, смеласці, адвагі і нязломнай мужнасці ў вобразе "волата літоўскай пушчы — зубра" яна паказала і сам народ, дала яскравыя карціны яго роду заняткаў, быту, філасофскіх поглядаў. У многіх месцах з яе эпічнага рытму вылучаецца роздум над вечнымі тэмамі літаратуры: вайна і мір, жыццё і смерць, трагічны лёс чалавека, у якога "заўтрашні дзень пад пагрозай" варожага нашэсця.

Вобраз зубра ўспрымаецца як поўны глыбокага сэнсу сімвал цэлай краіны, якую пісьменнік паставіў за мэту дастойна адкрыць Заходняй Еўропе. Суровыя выпрабаванні, што выпалі на долю радзімы паэта, павінны былі, на яго думку, ускалыхнуць "свет хрысціянства" і з'яднаць яго для адпору агульнаму ворагу.

"Песня пра зубра" напісана на класічнай лаціні, але ў ёй ёсць прыкметы жывой беларускай мовы. Увядзенне ў літаратуру эпохі Адраджэння ідэй, вобразаў, міфаў розных народаў і эпох было глыбока знамянальнай з'явай еўрапейскай цывілізацыі. Гусоўскі — пачынальнік жанру ліра-эпічнай паэмы ў літаратуры Усходняй Еўропы, стваральнік рэнесансавага мастацкага стылю ў літаратуры Беларусі.

Паэзія Гусоўскага паўплывала прама ці апасродкавана на станаўленне гісторыяграфіі Вялікага княства Літоўскага, росквіт лацінскай, уласнабеларускай, польскай і польска-беларускай літаратур, на развіццё такіх жанраў ва ўсходнееўрапейскай літаратуры, як лірыка-эпічная, гістарычная і сатырычная паэма, элегія, эпіграма.

Мікола Гусоўскі — таксама аўтар паэмы "Новая і славутая перамога над туркамі ў ліпені месяцы" (Кракаў, 1524 год), створанай ім за дзень па гарачых слядах падзей. Гэты твор зрабіў прыкметны ўплыў на развіццё жанру гераічнай паэмы і хронікі ў літаратурах Беларусі, Польшчы і Літвы.

У кракаўскі перыяд ім створана і паэма "Жыццё і подзвігі св. Гіяцынта" (1525 год). У яе прысвячэнні кракаўскаму ваяводу Хрыстафору з Шыдлоўца паэт гаворыць пра неабходнасць "адкрыцця" спраў славутых людзей мінулага для папулярызацыі іх жыцця. Многія радкі паэмы — гімн чалавечаму розуму, духоўнай велічы.

Узнікненне рэнесансавай беларускай літаратуры на лацінскай мове абумоўлена асаблівасцямі Адраджэння на Беларусі, якое сінтэзавала мясцовую, грэка-візантыйскую і заходнееўрапейскую культурныя плыні. Імя



Міколы Гусоўскага ЮНЕСКА ўключыла ў каляндар міжнародных дат вялікіх дзеячаў славянскай культуры. Да творчасці Гусоўскага звяртаюцца перакладчыкі, мастакі, драматургі, кінематаграфісты. Імем Гусоўскага названа вуліца ў Мінску.

Дарэчы, аўтар скульптурнай выявы Міколы Гусоўскага, што размешчана ў дворыку універсітэцкага гарадка, Уладзімір Панцялееў. І гэта першая скульптура нашага славутага суайчынніка ў Мінску.

*Падрыхтаваў Уладзімір СТАТКЕВІЧ*


**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

Заснавальнік газеты — БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года.

Газета надрукавана ў Выдавецкім цэнтры Белдзяржуніверсітэта 220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6
Ум. друк. арк. 1
Падпісана да друку ў 12.00

23 сакавіка
Зак. 135.
Т. 1000 экз.

Адрас рэдакцыі: 220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 7, паверх 4, пакой 411, тэлефон 206-61-43.

Рэдактар Т. М. КАЗАК

Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Камп'ютэрная вёрстка Яўгена Балаша